Бaброва А.Ю., студ. 138 гр. ФІДК
БДУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік – Тычко Г.К.,
докт. філал. навук, прафесар

# СУЧАСНЫЯ СТРАТЭГІІ ПАПУЛЯРЫЗАЦЫІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

**Сучасны стан беларускай літаратуры ў грамадстве.** Паскарэнне рытма жыцця, укараненне ў побыт тэлебачання і камп'ютэра прыводзяць да інфармацыйных перагрузак і да зніжэння ўласнай пазнавальнай актыўнасці. Разам з тым сучасныя СМІ і Інтэрнэт не могуць замяніць літаратуру. Нельга катэгарычна казаць аб тым, што беларускую літаратуру ўвогуле не чытаюць. Але відавочна, што яна ўспрымаецца беларусамі як літаратура на замежнай мове.

***Чаму беларускамоўная кніга не знаходзіць належнага попыту?***

***1.*** Расійскі літаратурны рынак шырэй за беларускі => умовы для беларускіх аўтараў і друкароў не спрыяюць распаўсюджанню беларускай літаратуры => магчымасць сустрэчы беларускай кнігі з чытачом памяншаецца. У рамках пануючага ў Беларусі білінгвізму (у рэальнасці рускай мовы), аўтары, каб здабыць больш шырокую аўдыторыю, стараюцца пісаць свае творы на рускай мове. У тых жа, хто піша па-беларуску, узнікаюць праблемы не толькі з аўдыторыяй, але і з публікацыяй твораў.

***2.*** Не сакрэт, што існуюць пэўныя стэрэатыпы наконт тэматыкі беларускай літаратуры ў асяроддзі сучаснай молодзі:

Янка Купала і Якуб Колас пісалі пра сялян;

Васіль Быкаў — пра вайну.

Папулярызуючы беларускую літаратуру, першачарговая задача – паказаць, што яна шматстайная ў тэматычным, жанравым, стылёвым планах.

***3.*** Імёны беларускіх класікаў вядомы амаль кожнаму (праўда, творы – далёка не ўсім), сучасных жа беларускіх аўтараў, на жаль, не ведае амаль ніхто… Значыць, трэба знаёміць з імі чытачоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Сітуацыя на кніжным рынку і месца беларускай літаратуры на ім.** Каб прааналізаваць рэальную сітуацыю на кніжным рынку, я пабывала ў цэнтральнай кнігарні г.Мінска. Годна прадстаўлены і ляжаць на бачным месцы руская класіка і сучасныя сусветныя творы. На жаль, месца, дзе знаходзіцца беларуская літаратура, аформлена ў стылі нейкага закутка, саломенныя і іншыя рэчы (венікі для дабрабыту ў хаце і інш.) даюць падставу думаць, што для многіх беларуская літаратура ўспрымаецца як нешта экзатычнае! За ўвесь час, праведзены мною ў гэтым аддзеле, пакупнікі цікавіліся беларускімі выданнямі толькі ў якасці падарункаў (на ўвазе маецца літаратура пра Беларусь, Брэсцкую крэпасць-герой, Белавежскую пушчу і г.д.). Беларускія сучасныя аўтары прадстаўлены шырока, але не сістэматызавана. Ёсць цяжкасці пры пошуку пэўнай кнігі. Кошт кніг прыемны, але рэкламы па новых выданнях не было. Узнікае пытанне аб тым, дзе чытач можа зацікавіцца беларускімі выданнямі, калі не у кнігарнях? Сустрэчы пісьменнікаў з чытачамі у кнігарне не праводзяцца (напрыклад, у Маскве такая практыка існуе). Відавочна, што такія сустрэчы ўздымаюць зацікаўленасць чытачоў да аўтара і яго твораў. Трэба разумець, што нашчадкі будуць вывучаць нацыянальную гісторыю па цяперашніх творах, большай часткай па прозе, дзе больш поўна адлюстраваны дэталі побыту і псіхалогія людзей нашага часу. А не па гістарычных раманах пра сярэднявечных князёў, якія, зразумела, таксама неабходныя.

**Сучасныя стратэгіі папулярызацыі беларускай літаратуры. Меркаванне беларускіх пісьменнікаў.** Нягледзячы на тое, што праблемы з папулярнасцю беларускай літаратуры існуюць, нельга казаць, што нічога не робіцца для іх вырашэння. Напрыклад, прома-гурт дзвюх маладых паэтэс Вікторыі Трэнас і Юліі Новік “ВЮ” паставіў сабе мэту прапагандаваць творы маладых беларускіх літаратараў. “ВЮ” праводзіць:

- музычна-візуальныя паэтычныя вечары;
- штогадовы праект “Выявы”, дзе прадстаўлены ўсе жанры – музыка, танец, карціны, на аснове літаратуры, канешне;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- вечары ў незвычайнай форме: аб’ядноўваючы, напрыклад, фальклор з постмадэрнісцкай паэзіяй і танцамі;
- серыю франка-беларускіх вечароў “Францыя ў сэрцы Беларусі”.

“ВЮ” ствараюць вобраз маладога паэта-эксперыментатара, які можа заінтрыгаваць публіку, дынамічныя і цікавыя паэтычныя вечарыны. Такім чынам, робячы свае праекты арыгінальнымі і незвычайнымі, гурт “ВЮ” захапляе моладзь беларускай літаратурай, і, як кажуць Вікторыя і Юлія, “звычайна, прыходзячы да нас аднойчы, людзі прыходзяць і ў наступныя разы” . Пісьменнік Альгерд Бахарэвіч, які зараз жыве ў Гамбургу, кажа так пра сучаснае становішча беларускай літаратуры: “У апошні час у Беларусі адбылася літаратурная рэвалюцыя, з'явілася шмат аўтараў, якія не замкнёны ў сабе, а існуюць у еўрапейскім культурным кантэксце і цалкам ўпісваюцца ў яго. Іншая справа, што яны пакуль яшчэ не запатрабаваныя ў Еўропе... ....На самой справе праблема ёсць, не хапае перакладчыкаў з беларускага. Але яшчэ некалькі гадоў, і сітуацыя зменіцца. У той жа Германіі я назіраю, што ўсё больш нямецкіх перакладчыкаў звяртаюць увагу на Беларусь, вывучаюць беларускую мову, жадаюць адкрыць Еўропе беларускую літаратуру”.

**Вынікі анкетавання студэнтаў.** Каб высветліць, што думае чытач аб беларускай літаратуры, было праведзена апытванне сярод моладзі горада Мінска і Брэста. У ім удзельнічалі 29 чалавек: студэнты БДУКМ (27%), БрГУ імя А.С. Пушкіна (27%), БрГТУ(10%), ІПД, БДУ, ГрДМУ (па 7 %), вучні ССНУ (14%). Была прапанавана анкета з дзесяці пытанняў (Гл. дадатак 1.) З аналізу адказаў вынікае наступнае:

- 62% апытваемых цікавяцца беларускай літаратурай толькі ў межах курса школы/вну, 21% увогуле не цікавіцца беларускай літаратурай, і толькі 17% цікавяцца ёй глыбей за рамкі праграмы.
- Прычыны “непапулярнасці” беларускай літаратуры аказаліся разнастайныя: самыя распаўсюджаныя адказы – гэта цяжкасці з разуменнем беларускай мовы (17%) і ўпэўненнасць у тым, што беларускія творы не такія

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цікавыя, як творы сусветнай літаратуры (17%). І ўсё ж большасць студэнтаў (69%) чытаюць беларускія творы ў арыгінале.

З гэтага вынікае, што папулярызацыю беларускай літаратуры патрэбна пачынаць з папулярызацыі беларускай мовы і ўвогуле іміджу ўсяго беларускага. Напрыклад, у адной анкеце была выказана думка, што ўсё ***беларускае*** моладдзю ўвогуле ўспрымаецца як нешта НЕЯКАСНАЕ. 14% апытаных адказалі, што аддаюць перавагу творам “масавай” літаратуры, якіх няма ў беларускай літаратуры. На самой справе такія творы ёсць і аўтары таксама (напрыклад, творы А. Глобуса, С. Сокалава-Воюша, Н.Батраковай і інш), але чытачы не ведаюць пра іх існаванне, паколькі выданні належным чынам не рэкламуюцца.

Былі і адказы, якія ніяк не залежаць ад мовы, на якой напісана кніга: недахоп часу на чытанне (14%) і нежаданне чытаць увогуле (7%).

- На жаль, пытанне “Якіх сучасных беларускіх аўтараў Вы ведаеце?” стала яскравым пацверджаннем дрэннай рэкламы сучасных выданняў. Амаль палова апытанных (41%) не ведаюць нікога!

Прыкладна 12% назвалі Я.Купалу, Я.Коласа, М.Багдановіча, У.Караткевіча і іншых класікаў, што, мне здаецца, сведчыць аб вялізарным уплыве навучальных устаноў на ўзровень знаёмства з беларускай літаратурай. Сумна, што моладзь не арыентуецца ў творчасці сучасных пісьменнікаў. Што падумаў бы расійскі чытач, калі б, наведаўшы кніжную краму, убачыў толькі творы Ламаносава, Дзяржавіна, Пушкіна, Гогаля – і нічога больш? І ўсё ж у нашай анкеце называліся некаторыя сучасныя пісьменнікі.

Аднак усё ж большасці апытаных (79%) цікавы тэмы, якія разглядаюцца ў беларускіх творах. Яны знаходзяць арыгінальныя творы свайго любімага жанру ў беларускіх пісьменнікаў (69%). І разам з тым, на пытанне “Ці цікавіцеся вы беларускай літаратурай?” ўсяго 5 чалавек (17%) адказалі: “Так!”. У чым прычына гэтага і як можна яе зліквідаваць? Мне здаецца — у стэрыатыпах грамадства і ў іх пераадоленні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларуская літаратура – духоўна багатая і каштоўная для беларускага народа. Але яна становіцца выбарам, на жаль, нешырокага кола чытачоў. Для яе папулярнасці не хапае большай рэкламы. У выніку праведзенага даследавання я выпрацавала практычныя рэкамендацыі, выкарыстанне якіх можа павялічыць зацікаўленасць беларускай літаратурай (гл. дадатак 1). У свеце шмат людзей вывучаюць ангельскую мову, каб чытаць Шэкспіра ў арыгінале, беларуская літаратура заслугоўвае гэтага таксама!

*Дадатак 1*

**Практычныя рэкамедацыі**

1. Скласці спіс найцікавейшых беларускіх твораў (з інтрыгуючай анатацыяй) і раскласці яго на абанементах бібліятэк.
2. Зрабіць плакат "25 твораў, якія патрэбна прачытаць да 25 гадоў". Вывесіць яго ў крамах і часопісах.
3. Яскравыя цытаты з кніг беларускіх аўтараў размясціць ў бібліятэках і кнігарнях у рубрыцы "Цікавішся? Чытай …….(твор, аўтар)".
4. Яскрава рэкламаваць літаратурныя навінкі ў СМІ.
5. Праводзіць сустрэчы з пісьменнікамі ў кнігарнях.
6. Друкаваць у газетах, часопіах крытыку на новыя выданні, каб узбудзіць зацікаўленасць чытачоў.
7. Уключыць у спіс літаратуры для школьнікаў/студэнтаў больш сучасных пісьменнікаў.
8. Папулярызаваць прэміі для самых «чытаемых» пісьменнікаў. Здымаць якасныя фільмы па творах беларускіх аўтараў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ